АПОШНЯЯ РЫБАЛКА ДЗЯДЗЬКІ РЫГОРА

У тую нядзелю, як, зрэшты, і ў будны дзень, вёска прачнулася рана: закукарэкалі пеўні, на розныя галасы забрахалі сабакі, забразгалі вёдрамі гаспадыні. У кожнай з іх былі свае справы, у нас з сябрукамі — свае. Мужчыны ў той дзень збіраліся пайсці на рыбалку, і нам, хлопцам, грэх было прапусціць такое відовішча. Мы рушылі ўслед за імі — у бок лазняку, праўда, трымаліся трохі паводдаль, бо ведалі, што дзядзька Рыгор (ён апошні ішоў, з таптухай) на рыбалцы гледачоў не любіць, а значыць, можа не проста шугануць нас, але і прагнаць дадому.

Дзякаваць богу, пранесла: хвілін праз дзесяць наша «працэсія» спынілася.

На беразе нехта з мужчын стаў надзяваць штаны са спецыяльна прарэзанымі дзіркамі, каб хутчэй вылівалася вада, нехта — абуваўся ў лапці, каб не параніць ногі...

Дзядзькі, як выглядала, загадзя размеркавалі і свае абавязкі, бо ні слова не кажучы трое мужчын з сеткай-таптухай адразу ж палезлі ў ваду (яе было дзе па пояс, а дзе і па шыю), чацвёрты заставаўся на беразе, каб збіраць гатовы ўлоў.

І вось «працэс» распачаўся. З кустоў мы ўважліва сачылі за ім. Найбольш — за дзядзькам Рыгорам. Бачылі, напрыклад, як ён тоўстым кіем «выганяе» рыбу з-пад берага, з-пад хмызняку, як тупае па дне нагамі — каламуціць ваду, чулі, як ён жа «размаўляе» з карасямі: я вам, маўляў, пакажу, будзеце ведаць, як у лозах хавацца... Ану ў таптуху...

Пасля гэтых ягоных слоў на бераг і сапраўды паляцелі першыя рыбіны. Яны, відаць, са страху таго, досыць высока падскоквалі на траве, пабліскваліна сонцы найчысцейшым срэбрам...

Але ж што гэта? Наш дзядзька Рыгор раптам змоўк, потым спыніўся, нікому нічога не кажучы, спешна рушыў да берага і потым гэтак жа спешна стаў выбірацца з вады. Праўда, зрабіць гэта было досыць складана, бо бераг слізкі, круты...

Нарэшце дзядзьку пашчасціла: ён вылез.

І тут мы заўважылі, што ў калашыне ягоных портак нешта... варушыцца, нават ходзіць хадуном. Падумалі, што гэта, мусіць, карась — праз адну дзірку ўлез, а вылезці не можа... Як раптам праз іншую дзірку сіганула... андатра.

Сказаць, што дзядзька Рыгор збялеў, спалохаўся і разгубіўся, значыць прамаўчаць. Мову яму адняло канкрэтна, рот сам па сабе адкрыўся, вочы глядзелі спачатку на ногі, потым на ваду, у якую сіганула андатра, а нарэшце — на мужыкоў:

— Хло-пцы, — па складах прамаўляў амаль знежывелы дзядзька, — я ж думаў, што гэта карась. А тутака...

Загнуўшы пару мацюкоў, ён злосна сплюнуў:

— Ды хай яна прападзе, гэта ваша рыба!

І сам амаль што подбегам рушыў у вёску.

Услед яму выбухнуў рогат — мужчынскі, раскацісты, гучны... Яму, здавалася, не будзе канца.

А таму не дзіва, што пра дзядзькаў «улоў» хвілін праз дзесяць пачула вёска, праз дваццаць — акруга. Размоў было — хоць адбаўляй, а ўжо смеху ды жартаў...

Стараніўся іх хіба дзядзька Рыгор, бо ён пасля гэтага выпадку на рыбалку — а тым больш з таптухай — болей не хадзіў.

Хоць лавіць рыбу і было дзе. Пакуль не асушылі балоты, шматлікія кар'еры, канавы і копанкі аж кішэлі рыбай... І галоўнае — не перасыхалі, бо сілкаваліся жывымі крыніцамі.

Вадзілася тады і шмат андатраў. Асобныя, седзячы на кладцы і звесіўшы хвост, старанна чысцілі свае футры. І толькі пачуўшы чалавека, сігалі, нырэлі ў ваду.

Валерый Васілеўскі,
г/п Глуск.

АДНО ВОКА БАЧЫЦЬ ДАЛЁКА...

Гэтым летам ехалі мы з братам з Глыбокага ў Мінск. Ехалі познім вечарам, і, каб, крый божа, не паснуць, расказвалі адзін аднаму розныя жыццёвыя гісторыі. Адна з тых, пачутых, мне спадабалася.

У пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя, расказваў брат, бухгалтарам у Глыбоцкім раённым аддзяленні Дзяржбанка працаваў стары халасцяк. Меў ён уласны дамок, невялікі гародчык, а са свойскай жывёлы — толькі ката. Ды такога ж памаўзлівага: то кавалак каўбасы са стала сапрэ, то, ловячы мух, вазоны паб'е, то з галавой залезе ў збанок з малаком і перакуліць... А неяк раз у суседзяў куранят падушыў...

Вось тут цярпенне ў гаспадара ўжо лопнула. Усё, падумаў, з мяне хопіць: трэба звозіць гэтага пустадомка — і чым далей, тым лепей, бо, калі блізка, то яшчэ возьме ды вернецца.

Добрых дарог тады амаль не было, транспарту бракавала таксама і хадзіў ён рэдка. Таму банкаўскія работнікі, калі з'яўлялася патрэба ў далёкіх паездках, шукалі нешта спадарожнае. Напрыклад: ідзе з райспажыўсаюза машына ў абласны цэнтр (тады — гэта быў горад Маладзечна), значыць, можа некага падвезці — туды, потым назад.

Дык вось у нейкі з дзён выбраўся ў камандзіроўку і той халасцяк-бухгалтар. Ката таксама з сабой прыхапіў. Па дарозе сказаў кіроўцу:

— Я амаль да вечара ў банку прабуду. Справы там. На зваротным шляху ты мяне падбярэш. А зладзюжку вось гэтага дзе-небудзь у горадзе выпусці.

— Мясакамбінат падыдзе? — спытаў кіроўца.

— А чаму б і не, — згадзіўся гаспадар. — Там ён дакладна не прападзе.

Аднак пакрасці свежых каўбас кату не прывялося, бо кіроўца быў чалавекам з гумарам. Да таго ж у горадзе сустрэў калегу-земляка. Папытаўся:

— Ты ж у Глыбокае раней паедзеш? То зрабі мне ласку — захапі вось гэтую торбу.

Везці, як вядома, не несці — пуп не сарвеш. Так што згадзіўся чалавек. Торбу з катом паклаў у машыну, без прыгод даставіў да райцэнтра і выпусціў. Злодзей, апынуўшыся на волі, адразу падаўся дамоў.

...Туды ж бліжэй да вечара вяртаўся і бухгалтар. Настрой у яго, яшчэ мякка кажучы, быў паганы-паганы. Усю дарогу думаў чалавек, што ката за ягоныя паводзіны іншы гаспадар ад дома адлучыў бы даўно... Гэта — з аднаго боку. А з іншага — шкада валацугу... Ды і цікава, як ён — на новым месцы? Ці здабудзе сабе кавалачак мяса? Ці знойдзецца нейкая добрая душа, каб наліць яму малака, пагладзіць па спінцы?

І сябе самога бухгалтар шкадаваў таксама, бо якніяк меў у хаце жывую істоту, а вось зараз... Нават пасварыцца не будзе з кім!

Да хаты ногі яго не неслі, але ж неяк дайшоў і...

Вачам не паверыў: на ганку сядзеў яго кот і лапкай мыў за вушамі.

— Ты вярнуўся?! — узрадаваўся бухгалтар. — Знайшоў дарогу? Прыбег?..

Потым ён, вядома ж, зразумеў, што не такі ўжо злодзей і спрытны: хлопцы пажартавалі. Але ж крыўдзіцца на кіроўцу не стаў. Наадварот: збіраўся чарку наліць, бо як ні круці, адно вока бачыць далёка, а два — яшчэ далей. І напару — нават з катом — лепш, чым аднаму.

П.І. Браток,
г. Мінск.

КАМУ ЧОРТ ДЗЯЦЕЙ ЛЮЛЯЕ

...Чалавек той быў, можна сказаць, ніхто. Хаця — не: мянушку меў досыць гучную — Заправіла. А ўсё таму, што працаваў ён у калгасе загадчыкам склада гаруча-змазачных матэрыялаў.

Пасада як пасада, здавалася б, нічога асаблівага — ні цяпер, ні ў савецкія часы. Але ж гэты чалавек думаў інакш. Ён лічыў сябе пупам Зямлі, а, можа, нават сусвету, хоць пра яго нічога, відаць, не ведаў, бо замест «малпа» казаў «налпа», а двойчы два складаў у слупок.

Як жа, спытаеце, гэткі «матэматык» мог займаць адказную пасаду? Ды, як казаў Шэрлак Холмс, элементарна. Ён з патрэбнымі людзьмі добра знаўся: у лазню да сябе запрашаў, смачна паіў ды карміў, з сабою шмат што даваў. У яго для гэтага досыць моцная гаспадарка была: кароў трымаў, свіней, розную птушку, пасеку меў, самагонны апарат...

Яно б і няхай, на здароўе, як той казаў, калі б гэты «руплівец» сам працаваў. А то ж усё жыццё пад'язджаў на некім — дурных шукаў. І за ўсе паслугі разлічваўся аднолькава: гарэлкай, бо дурням жа больш нічога не трэба.

Дык вось. Неяк раз тыя самыя дурні навазілі яму поўны падворак дроў — парэзаных. Гаспадару заставалася толькі пакалоць і, вядома ж, не сваімі рукамі. Ён для гэтага зноў дурных пашукаў. Тых ці іншых якіх, — не так ужо і важна. Важна, што адзін з іх раптам сказаў:

— Ну і свалата ж гэты Заправіла! Не, каб нам за нашу працу рублём заплаціць ці нашым дзецям мёду якога даць, дык не. За людзей нас не лічыць, хоча на халяву ўсё. Прывык, бач, абдурваць... Мужыкі, а давайце і мы яго...

— А як? — загарэліся вочы ў хлопцаў.

— План такі: палову калодак мы паколем, а астатнія — дровамі закідаем.

І закасалі яны рукавы, і закіпела работа. Мужчынам нават курыць не хацелася — такі энтузіязм з'явіўся...

Факт, што гаспадар з работы вярнуўся і аж шапку зняў:

— Малайцы, — сказаў, — стаханаўцы, хутка справіліся. Я нават не чакаў...

Потым — як і абяцаў — гарэлкі вынес.

Мужчыны яе з ахвотай выпілі і з падворка сышлі пераможцамі.

Адзінае, што пахадзілі ў іх нядоўга, бо лета ж на дварэ — сонейка, ветрык. Дровы як бачыш высахлі: іх трэба было знасіць у дрывотню, акуратненька скласці.

Каб зрабіць гэта, Заправіла зноў паклікаў «стаханаўцаў» — тых самых мужыкоў-пераможцаў.

Яны, бедныя, доўга аднеквіліся — не хацелі згаджацца. Але ж гэта каханне да мужчын прыходзіць і сыходзіць, а вось выпіць ім хочацца заўжды.

Таму «стаханаўцы» ўрэшце згадзіліся.

Заправіла, праўда, не зразумеў, чаму дровы насіць яны прыйшлі з сякерамі...

Потым вельмі здзівіўся, што так доўга складалі — нават даўжэй, чым секлі...

Але ж абяцаны разлік ім выдаў.

Так што прымаўка пра тое, што скупы плаціць двойчы, на мой погляд, не заўсёды праўдзівая, а вось што багатаму і чорт дзяцей люляе, мусіць, заўжды.

А. Ліпень,
Іўеўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Неасабісты суб'ектыў

Час непрыкаяных старых

Хто для нас бацькі, якіх прывозім на зіму ў свае гарадскія кватэры?

У гэтага не самага вясёлага часу, калі і не восень, і не зіма, калі ноч змяняецца прыцемкамі, калі адубелыя дрэвы цягнуць у нямым літанні свае голыя кашчавыя рукі да свінцовага абыякавага неба, а сонца, калі і прабіваецца на колькі рэдкіх хвілін, дык толькі дзеля таго, каб паслаць кволую бездапаможную ўсмешку гэтай самотнай зямлі і зноў надоўга схавацца за заслону халоднай смугі, — і назвы адпаведныя. Піліпаўка, воўчы месяц, воўчыя вяселлі — гэта з фальклору. Час роздуму, смутку і боязі адзіноты — гэта з псіхалогіі. Час непрыкаяных старых — гэта з сучаснага жыцця вялікага горада.

За гэтымі бабулямі, што кожныя выхадныя сядзяць на лаўцы каля суседняга шматпад'езднага дома, я напачатку назірала нават з замілаваннем. Прыбраныя ў квяцістыя хусткі «з люраксам» (у вёсцы такія завязвалі толькі на самыя вялікія святы), у акуратных балоневых паліто ці «плашчоўках», купленых у 80-х гадах мінулага стагоддзя, у цёплых бурках на нагах, з добрымі зморшчынкамі каля вачэй, з вялікімі спрацаванымі рукамі, што стомлена ляжаць на каленях... Побач топчуцца два дзяды з кіёчкамі, але выгляд маюць зухаваты, жартуюць са сваімі сяброўкамі, з адным заўсёды — пародзісты сабачка на павадку, за які старому даводзіцца пастаянна тузаць, бо жывёлка ну ніяк не можа зразумець, што за цікавасць стаяць каля пад'езда з нейкімі бабкамі...

Гэткая, можна сказаць, сезонная ідылія: гарадскія дзеці, клапоцячыся аб састарэлых бацьках, забіраюць іх на зіму ў горад — да цяпла і выгод. І старым добра: яны ў доглядзе, і не сумна ім тут, як магло быць у вёсцы, дзе на ўсю доўгую вуліцу адзін ліхтар, і той гарыць толькі з вечара, дзе суседзі — толькі праз пяць апусцелых на зіму хат... Ім нават весела: знаёмяцца з гэткімі ж «дачнікамі», якіх цяпер у кожным доме па некалькі чалавек, у іх агульныя інтарэсы, ёсць пра што пагаварыць...

ПРЫБЛІЗНА так я разважала ўслых у мінулую пранізаную сіверам суботу, вярнуўшыся з паходу па крамах і адгараваючы пры батарэі змерзлыя рукі. Яшчэ і здзіўлялася паблажліва: маўляў, ахвота гэтым бабкам на такі холад на вуліцу цягнуцца... «Ды ім проста падзецца няма дзе, — перабіла раптам мой захоплены маналог маці. — Ты думаеш, ад добрага жыцця яны гэткім надвор'ем на вуліцу ідуць? Асабліва на выхадныя, калі ўся сям'я дома, дзед ці бабуля ўсім замінаюць: не там сеў, не так паглядзеў, не тое сказаў. Каб у кагосьці з іх была магчымасць паклікаць сваіх прыяцеляў у госці, папіць у цяпле гарбаты, пагаварыць пра жыццё — што, яны б стаялі на вуліцы? Ці хадзілі б гадзінамі па парку — ад адной лаўкі да другой? Бывала, кажу ім у тым парку: пайшлі ўжо, маўляў, па дамах — хопіць ужо на сёння. Ведаеш, што часцей за ўсё чую ў адказ? Не, яшчэ пабуду, бо што адной дома рабіць, сяджу на ложку, як лялька. Ці наадварот: не, яшчэ пасоваюся трохі, там ужо ўнучка з вучобы прыйшла, я ёй замінаць буду... Дзіва што тая Гарошчыха калісьці пабыла ў пляменніка месяц ды і вярнулася ў дзіравую хату».

Бабка Гарошчыха, наша суседка, дажывала свой век адна ў невялікай неабшаляванай хаціне пад гонтавай страхой. Была ў яе сям'я, але муж памёр маладым, а малога сына забіў капытом бычок. З радні ў бабулі застаўся толькі пляменнік. Аднойчы, калі ёй ужо было за восемдзесят, угаварыў яе на зіму пераехаць у сваю гарадскую кватэру. У Мінску бабка пабыла месяц, вярнулася ў вёску ў самы сцюдзёны час. «Сяджу як воўк цэлы дзень адна, пакуль яны на рабоце, — расказвала пасля. — Нікуды не лезу, каб што не папсаваць. Прыйдуць увечары — паесці дадуць, тэлевізар у сваім пакоі ўключаць, а я зноў адна, як і ў вёсцы. Дык тут хоць хатка свая, родная, і раблю, што захачу...» Да пляменніка бабуля больш не паехала. Памерла ў 98 гадоў у інтэрнаце для састарэлых, куды мы яе здолелі ўладкаваць, калі стала ўжо зусім нямоглая.

Я пасля той суботняй размовы з мамай упершыню падумала пра тое, што гэтыя бабкі на вуліцы (а можа, часам і мой самы блізкі чалавек) адчуваюць сябе так сама, як наша старая суседка, калі сярод зімы ехала з цёплага пакоя ў прамерзлыя сцены свайго вясковага жытла. Забіраючы сваіх немаладых вясковых бацькоў на зіму ў горад (а ў апошнія гады, калі многія змаглі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, гэта стала справай звычайнай), вырываючы іх з прывычнага асяроддзя, мы шчыра верым, што робім вельмі добрую справу. Не вельмі пры гэтым клапоцячыся і задумваючыся, што ім насамрэч патрэбна, акрамя цёплай чыстай пасцелі, смачнай ежы ды дзяжурных пытанняў пра сон і самаадчуванне.

Пры гэтым, сыходзячы з хаты, не забываем папярэджваць: гэтага не ўключай, сюды не лезь. Зноў жа з вельмі гуманных меркаванняў: каб стары чалавек не спалохаўся якой тэхнічнай неспадзяванкі. (А калі больш шчыра: каб сваімі няспрытнымі непрывычнымі рукамі не сапсаваў новую мікрахвалёўку ці сучасны тэлевізар, за які яшчэ летась аддалі ажно дзесяць мільёнаў.) Калі ж нават не папярэджваем услых, яны са сваёй вясковай далікатнасцю ўсё роўна нічога не будуць браць і ўключаць, бо не было дазволу, бо не ў сябе дома. Гэтаксама і з новымі знаёмымі, якія з'яўляюцца ў іх па суседстве. Маці ніколі не запросіць у дом гэткую самую прыезджую з вёскі кабету, з якой ужо даўно пасябравала, з якой перагаворана ўжо і пра дзяцей-унукаў, і пра сядзібу-агарод, і пра трывогі-немачы. Гэта ў вёсцы яны б ужо штодня хадзілі б адна да адной у госці, а тут нельга, бо не ў сябе дома, бо дачка ж ці сын не сказалі: што там у цябе за сяброўка, няхай прыходзіць, пасядзіце на кухні, гарбаты пап'яце. (І не скажам, праўда, бо навошта нам лішнія клопаты ды яшчэ чужы чалавек у хаце...) Я ўжо не кажу пра тое, каб звадзіць бацьку ці маці ў тэатр, на выставу. Або проста пакатаць па новых станцыях метро. (Пражыў чалавек без гэтых дзівосаў усё жыццё, ці ж яму гэта патрэбна, ці ж яму будзе цікава, а самі толькі час патрацім, якога і так ні на што не хапае, — так прыкладна разважаем.)

КАЛІ ўжо такая размова шчырая зайшла: хто для нас бацькі, якіх прывозім з вёскі на зіму ў свае гарадскія кватэры? Неабходны сезонны прадмет інтэр'еру, сімвал нашых найлепшых душэўных якасцяў? Нянькі для дзяцей, катоў, сабак, папугаяў, іншых хатніх гадаванцаў? Ці самыя родныя людзі, якія павінны адчуваць сябе ў нашых кватэрах нават не як дома, а проста — дома?

...Бабуль каля суседняга дома сёння не было. Снег, холад — сезон непрыкаяных старых заканчваецца. Сядзяць, пэўна, самотна па сваіх пакоях, успамінаюць маладосць, мараць пра лета, калі можна будзе вярнуцца ў сваю хату.

А можа, зусім не так. Сабраліся дзесьці сваёй кампаніяй на кухні, п'юць гарбату з якой смакатой, весела размаўляюць. Гаспадыня паказвае альбомы з фоткамі, хваліцца ўнучкай: вось зараз вернецца са школы, убачыце, якая прыгажуня ды разумніца.

ВЕЛЬМІ хочацца верыць менавіта ў гэты сцэнарый. Хоць бы дзеля самазаспакаення.

Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*